# ПЕРААСЭНСАВАННЕ САЦЫЯЛЬНАЙ ФУНКЦЫІ НАРОДНАЙ ПЕСНІ Ў СВЯЦЕ

**Аляхновіч А. М.**
*кандыдат філалагічных навук,*
*прафесар кафедры рэжысуры абрадаў і свят*
*УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*
*(Рэспубліка Беларусь, г. Мінск)*

Вывучэнне пытанняў пераасэнсавання фальклорнай песні ў свяце – вельмі важная задача, паколькі будзе спрыяць захаванню і выкарыстанню песеннай традыцыі ў такой важнай сферы як абрадава-святочная культура.

Змены народнай песні ў свяце тлумачацца наступнымі прычынамі. Па-першае, у многіх з іх апавядаецца аб тых абставінах, якія ўжо не існуюць у рэальным жыцці, а ў мінулым былі звязаны з каляндарнай або сямейнай абраднасцю. Сёння многія з іх успрымаюцца як лірычныя або жартоўныя творы. Яны выконваюць гісторыка-пазнавальныя, эстэтычныя і выхаваўчыя функцыі, трактуюцца выканаўцамі і слухачамі як мастацкія творы аб даўнім мінулым народа. Па-другое, сучасны слухач або глядач успрымае народную песню ў свяце перш за ўсё як мастацкую з'яву. Ён можа і не ведаць, што песня, якую ён слухае, выконвалася ў пэўны час і была аднесена да канкрэтнага абраду. Па-трэцяе, святочнае выкананне мае свае законы і правілы. Яны рэгламентуюцца часам, сцэнічным дзеяннем, пэўным размяшчэннем спевака або групы выканаўцаў на сцэне, якое адрозніваецца ад звычайных умоў. Асноўнае прызначэнне сцэнічнага мастацтва заключаецца ў задавальненні эстэтычных запатрабаванняў аудыторыі. Менавіта таму сцэнічнае пераасэнсаванне народнай песні «азначае пераход ад адной формы мастацтва да другой, якасную змену не выканання, а жыцця народнай песні» [4, с. 10].

Фальклорны твор на сцэне ў пэўнай ступені губляе натуральнасць і імправізацыйнасць. Сцэна стварае дыстанцыю паміж выканаўцамі і слухачамі, якія становяцца пасіўнымі ўдзельнікамі мастацкай творчасці.

У той жа час народная песня ў свяце становіцца вядомай шырокаму колу слухачоў, што садзейнічае пераадоленню пэўнай ізаляцыі бытавання, пашырэнню сферы жанравых сувязей, узаемадзеянняў, аказвае адваротны ўплыў на выкананне ў побыце. Дзякуючы сцэнічнаму выкананню і сучасным сродкам камунікацый народная песня атрымлівае шырокае распаўсюджванне і становіцца як бы эталонам выканальнасці для іншых спевакоў або калектываў.

На сцэне сацыяльная функцыя народнай песні якая страчваецца, кампенсуецца ўзмацненнем яе мастацка-выяўленчых сродкаў. Вядучай функцыяй становіцца эстэтычная. Выкарыстанне ў свяце народнай песні пацвярджае метадалагічнае палажэнне даследчыка П. Г. Багатырова аб пераасэнсаванні яе функцый ў жывым бытаванні: «Структура функцый народнай песні, гэтак жа як структура іншых сацыяльных фактараў, не застаецца нязменнай; яна няспынна трансфармуецца; функцыі, што былі некалі асноўнымі, займаюць другараднае месца і іншы раз знікаюць зусім; у іншых выпадках другасныя функцыі становяцца асноўнымі; з'яўляюцца, нарэшце, новыя функцыі» [2, с. 211].

З гэтай высновай нельга не пагадзіцца. Сапраўды, фальклор вызначаецца шматзначнасцю функцый. Гэта такія, як сацыяльная, выхаваўчая, пазнавальная, этычная, эстэтычная, інфарматыўная, камунікацыйная, рытуальная, пацяшальная і інш. Кожная з функцый фальклору можа праяўляцца ў залежнасці ад змянення грамадскіх умоў жыцця людзей. Напрыклад, у штодзённым побыце ў вясельных песнях рытуальная функцыя страчвае сваю вядучую ролю, уступаючы эстэтычнай.

Трансфармацыя абрадавага фальклору ў побыце ажыццяўляецца ў плане яго ігравога пераасэнсавання. Пры гэтым назіраецца і процілеглы працэс, калі падобныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

па сюжэту і эмацыянальнаму складу неабрадавыя песні пераходзяць у абрадавыя цыклы. Практычная функцыя народнай песні ў рэальным жыцці ніколі не выступала і не выступае ізалявана (насупраць з ёй у той ці іншай ступені звязаны іншыя). Аднак вядучай у кожны гістрычны перыяд часу з’яўляецца якая-небудзь адна функцыя, а астатнія як бы знаходзяцца ў эмбрыянальным стане і чакаюць спрыяльных умоў для свайго праяўлення і развіцця.

У беларускай народнай творчасці гэта знаходзіць выражэнне ў страце фальклорным творам свайго функцыянальнага прызначэння. Ён пачынае жыць як мастацкі твор. У жыцці мы можам назіраць, як некаторыя народныя песні страцілі сваю былую вядучую функцыю. Больш за ўсё сацыяльныя змены, на думку З. Я. Мажэйкі, закранулі абрадавы бок фальклору, а таксама працоўную песні і такія творы, якія маюць зачаткі канцэртнасці [3, с. 54].

Вялікая колькасць беларускіх песень аб нялёгкім жаночым лёсе, напрыклад, «Як у полі вецер вее», «Перапёлка», «А ў цёмным лесе», «Бела чаечка», «Дубровушка ды зялёная», вызначаюцца шчырасцю пачуцця, высокай паэтычнасцю верша, музычнасцю напеву. Вядучай функцыяй гэтых песень з’явілася сацыяльная, якая адлюстроўвае нялёгкі лёс дзяўчыны. Але ў гэтай функцыянальнай іх накіраванасці змяшчаюцца і эстэтычныя, і псіхалагічныя элементы, якія атрымліваюць у сучасных умовах вядучае становішча.

На пераасэнсаванне народнай песні ў быту аказалі змены інтанацыйнага ладу пад уплывам гарадской песеннай культуры. З сярэдзіны XIX ст. яна актыўна асімілюе рысы гарадской песні і раманса. Песенныя жанры ўзнікаюць у неаднолькавых умовах і дасягаюць росквіту ў розныя эпохі. Так, калі абрадавыя, гістарычныя песні звязаны ў большай ступені з развіццём і станаўленнем ранніх класавых этнічных супольніцтваў, то лірычныя – з перыядам сацыяльнай раз’яднанасці, выдзялення чалавека з абшчыны, умацаванне класавых адносін.

Такім чынам, можна зрабіць вывад, што ў працэсе гістарычнай эвалюцыі сацыяльная функцыя народнай песні пераасэнсоўваецца, ўступаючы месца іншым. Трансфармацыю музычных элементаў народнай песні ў працэсе сацыяльнага пераасэнсавання на прыкладзе жніўных песень беларускага Палесся ў аудіо час раскрыла З. В Эвальд [5, с. 17–19].

У самой прыродзе песеннай традыцыі закладзены перадумовы для трансфармацыі. Такія якасці фальклору, як калектыўнасць, варыятыўнасць, вуснасць бытавання, імправізацыйнасць і іншыя, ствараюць спрыяльныя перадумовы для пераасэнсавання народных песень, прыстасавання іх да новых сацыяльна-грамадскіх умоў бытавання.

У свяце народная песня атрымлівае дальнейшыя ўмовы для пераасэнсавання, пераваладання ў ёй мастацкай эстэтычнай функцыі, далучэння да яе выканання не толькі ўдзельнікаў, але і гледачоў. Яна становіцца вядомай шырокаму колу выканаўцаў, нягледзячы на тое, што губляе свае якасці – натуральнасць выканання.

Можна зрабіць выснову, што ўзнаўленне народнай песні ў свяце мае як станоўчыя, так і адмоўныя моманты, носіць супярэчлівы характар. У пэўным аспекце свята абмяжоўвае магчымасці раскрыцця народнай песні: адсутнасць стварэння фальклорнай сітуацыі, падзеі, сувязей з бытавымі ўмовамі, абмежаванасць выканання ўмовамі сцэны, немагчымасць рэалізацыі прыроды народнага выканальніцтва – яго імправізацыю.

У той жа час гэтыя абмежаванні ўзнаўлення народнай песні ў свяце кампенсуюцца набыццём ёю іншых станоўчых якасцей: далучэння шырокага кола гледачоў (слухачоў) да хараства выканання песеннай традыцыі, раскрыцця прыгажосці яе меласу, атрымання эстэтычнай асалоды ад творчых здабыткаў народа.

Узнаўленне народнай песні ў свяце закранае яшчэ адну важную праблему – ролю тых, хто займаецца яе выкарыстаннем на сцэне, перш за ўсё рэжысёраў, якія абавязаны ствараць умовы для раскрыцця характару песеннай традыцыі. Рэжысёр абавязан ведаць тыпалогію фальклярызму ў мастацкай творчасці [1, с. 357–360]. Ён можа і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абавязан аказаць дапамогу выканаўцам у тэатралізацыі народнай песні на сцэне, знаходжанні вобразаў і персанажаў, мізансцэн, рухаў, пластыкі. Ідэальная форма ўвасаблення народнай песні ў свяце – гэта стварэнне маленькага «спектакля» яе паказу – з завязкай, развіццём дзеі, фіналам.

Пераасэнсаванне народнай песні абумоўліваецца таксама музычным інструментальным суправаджэннем, якое садзейнічала ўзнікненню эпізадычных адхіленняў ад асноўнай мелодыі. Не выпадкова Г. І. Цітовіч лічыў адной з умоў развіцця ладу, мелодыкі і шматгалосся народных песень, прымяненне народных музычных інтсрументаў. [6, с. 2]. Ужо пры антыфонным выкананні народных песень у суправаджэнні валынкі або ліры з характэрным для іх бурдонным гучаннем узнікае дыяфанія (старадаўні від шматгалосся). Музычныя інстументы ў прыгожваюць і узбагачаюць гучанне многіх народных песень, пашыраючы іх гарманічныя і меладычныя магчымасці.

Пераасэнсаванне песеннай традыцыі ў свяце, як ужо падкрэслівалася, адбываецца складана і супярэчліва. Трансфармацы або знікненне той ці іншай сацыяльнай функцыі народнай песні прыводзіць да пэўнай жанравай узаемадзейнасці. Гэта тлумачыцца тым, што ўдзельнікі святочнай дзеі здольны асвойваць адначасова творы розных песенных жанраў. Можна зрабіць вывад, што межы паміж імі рухавыя, не вызначаюцца дакладным падзелам.

Выкарыстанне песенных жанраў у свяце вызначаеца ўменнем рэжысёра і ўдзельнікаў калектываў творча выкарыстоўваць прыроду жанра. Творчай інтэрпрэтацыі некаторых жанраў садзейнічае транфармацыя абрадаў, якія ў сучасным грамадстве набываюць новы змест. На першы план у іх выступае эстэтычная функцыя, таму яны не страчваюць для нас сваёй прывабнасці. Аднак не ўсе жанры маюць патэнцыяльную магчымасць адаптацыі да сацыяльных і культурных змен і таму не церпяць трансфармацыю. Напрыклад, жніўныя, некаторыя веснавыя і вясельныя песні працягваюць жыць, захоўваючыся ў памяці людзей сярэдняга і старэйшага пакаленняў.

Выкарыстанне фальклорных песень у свяце можа мець свае разнавіднасці, вызначацца рознай манерай узнаўлення фальклору, у адпаведнасці са сваімі творчымі інтарэсамі і магчымасцямі, вырашацца пытаннямі рэпертуару, этнаграфічнага кантэксту, захавання элементаў сінкрэтызму фальклору, адэкватнасці свайго выканальніцкага стылю, канкрэтнай мясцовасці і г.д.

Узнаўленне фальклорных песень у свяце мае свае асаблівасці. Змяняючыся пры выкананні, песня павінна задавальняць пры гэтым сучасныя эстэтычныя запатрабаванні аудыторыі. У сувязі з гэтым неабходна адабраць рэпертуар, увесці ўмоўны сцэнічны касцюм, зрабіць пэўную апрацоўку твораў. У свяце жыццё песні, танца, абраду скарачаюцца ў часе – такія законы канцэртнага выканання.

Цікава, што ў свяце ствараюцца спрыяльныя ўмовы для вяртання фальклорнай песні ў народны быт. Сапраўды, песня, якая падабалася, калі гучала ў свяце, як паказвае практыка, пачынае «другое» жыццё, распаўсюджваецца ў народзе, набывае варыянты як бы «фальклярызуецца». Відаць, што святы ствараюць магчымасць звароту некаторых народных песень у жывое бытаванне.

У свяце народная песня павінна адпавядаць духу часу, узроўню нашага мастацкага мыслення. Для задавальнення гэтых запатрабаванняў грамадства на сучасным этапе не дастаткова простага ўзнаўлення або капіравання фальклорных форм. У прынцыпе кожная творчасць можа быць прымальнай, калі яна пададзена таленавіта. У данным выпадку гутарка ідзе аб пашырэнні і паглыбленні фальклорных традыцый, аб творчай іх пераапрацоўцы ў новых умовах. Як бы мы не засмучаліся з прычыны знікнення некаторых песень, спыніць гэты працэс немагчыма. Сучаснае жыццё адрозніваецца ад таго, у якім узніклі старадаўнія песні. Фальклорны калектыў не павінен слепа капіраваць манеру выканання старых спевакоў, бо гэта прыводзіць да штучнасці выканання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Можна заўважыць, што фальклорны матэрыял у святе ўзноўлены з этнаграфічнай дакладнасцю, не заўсёды ўспрымаецца па той прычыне, што ва ўмовах сцэны фальклорны твор не атрымаў свайго адэкватнага мастацкага ўвасаблення, многае ў ім знікае, губляецца. Справа ў тым, што народная песня павінна быць на сцэне пастаўлена. Якраз святочныя ўмовы спрыяюць таму, што народная песня раскрывае сваю глыбінную сутнасць.

Такім чынам, у сучасным святе лепшыя традыцыі народнага выканальніцтва атрымліваюць далейшае развіццё, пераасэнсоўваючы сацыяльную функцыю народнай песні ў эстэтычным накірунку, з улікам сучасных густаў грамадства.

Падсумоўваючы сказанае, лічым мэтазгодным выдзеліць наступныя ўзроўні пераасэнсавання народнай песні ў святе:

1. Народная песня ўзнаўляецца без якіх-небудзь змяненняў тэксту і мелодыі. На гэтай ступені пераасэнсавання носіць выключна выканальніцкі характар, напрыклад, можа паскарацца або запавольвацца тэмп, выкарыстоўвацца элементы тэатралізацыі, ўдакладняцца сэнсавыя націскі і дынаміка і г.д.

2. Сцэнічнае пераасэнсаванне народнай песні, якое ажыццяўляецца шляхам замены некаторых архаічных слоў, скарачэння куплетаў, некаторых строф. Такая рэдакцыя тэкста фальклорнага твору абумоўлена перш за ўсе умовамі сцэнічнага выканання, якое павінна доўжыцца 3–5 хвілін, інакш не ўспрымаецца слухачамі як мастацкая з’ява. Акрамя таго, змест некаторых старадаўніх песень не заўседы адпавядае нашым сучасным уяўленням аб адносінах паміж людзьмі, навакольным свеце, маральных каштоўнасцях. Такое пераасэнсаванне народнай песні павінна вызначацца добрым густам выканаўцаў, яго не трэба разглядаць у цэлым як спрошчанае, механічнае прыстасаванне да новых умоў.

3. На данай ступені ўзнаўлення традыцыйнай песні ў святе выкарыстоўваюцца іх розныя апрацоўкі, выкананыя як прафісіянальнымі музыкантамі, так і аматарамі. На жаль, многія з гэтых апрацовак не захоўваюць характар і дух народнай песні. Неабходна, каб рэжысеры фарміравалі песенны рэпертуар для выкарыстання ў святе з улікам яго мастацкай вартасці, беражлівых адносін да апрацовак, якія захоўваюць спецыфіку фальклорнай першакрыніцы. Фальклорны рэпертуар павінен быць высокамастацкім, вызначацца беражлівымі адносінамі да песеннай спадчыны, спрыяць яе эстэтычнаму пераасэнсаванню ў святе, выхоўваць этнічныя якасці ўдзельнікаў і гледачоў, фарміраваць нацыянальны менталітэт беларусаў.

***Літаратура***

1. Аляхновіч, А. М. Тыпы фальклярызму ў мастацкай творчасці / А. М. Аляхновіч // Культура. Наука. Творчество = Культура. Навука. Творчасць = Culture. Science. Arts : материалы IV Междунар. Науч.-практ. конф., Минск, 20–23 апр. 2010 г. / Бел. гос. акад. искусств. – Минск, 2011. – С. 357–360.

2. Богатырёв, П. Г. Народная песня с точки зрения её функций / П. Г. Богатырёв. – Воронеж, 1973. – 211 с.

3. Можейко, З. Я. Календарно-песенная культура Белоруссии / З. Я. Можейко. – Минск, 1985. – 247 с.

4. Путилов, Б. Н. Фольклор и художественная самодеятельность / Б. Н. Путилов // Фольклор и художественная самодеятельность. – Л., 1968. – 232 с.

5. Эвальд, З. В. Социальное переосмысление жнивных песен белорусского Полесья / З. В. Эвальд // Сов. Этнография. – 1934. – № 5. – С. 17–39.

6. Цитович, Г. И. Новые стилевые черты традиционной белорусской песни / Г. И. Цитович. – М., 1964. – 17 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ